# НА ВЫСТАЎЦЫ «НАВУКА І ЛІТАРАТУРА БССР ЗА ТРЫЦЦАЦЬ ГОД»

Адкрытая ў залах бібліятэкі імя Леніна выстаўка матэрыялаў аб дасягненнях нашай рэспублікі ў галіне навукі і літаратуры карыстаецца вялікім поспехам у чытачоў сталіцы. За два тыдні яе наведалі тысячы чалавек, экскурсіі школьнікаў і студэнтаў. Тут пабывалі многія ўдзельнікі юбілейнай сесіі Акадэміі навук БССР, госці з брацкіх рэспублік.

Найбольшую цікавасць выклікаюць стэнды, на якіх паказана дзейнасць шматлікіх інстытутаў Акадэміі навук БССР, Беларускай плодагароднай станцыі, Беларускай селекцыйнай станцыі і многіх вышэйшых навучальных устаноў.

Пад шклом у вітрынах ляжаць яблыкі — перспектыўныя гібрыды і гатункі, выведзеныя Беларускай плодагароднай станцыяй. Побач з імі велізарныя качаны капусты, цыбуля, морква, выведзеныя на аснове дасягненняў перадавой мічурынскай навукі. На карце адзначаны сувязі станцыі са шматлікімі апорнымі пунктамі, вытворча-вопытнымі садамі, вопытнымі ўчасткамі і калгаснікамі-вопытнікамі.

Шырока паказана работа селекцыйнай станцыі, якая атрымала рад перспектыўных гатункаў збожжавых, дзейнасць інстытута хіміі і інстытута меліярацыі, воднай і балотнай гаспадаркі. Справаздачы аб сваёй шматгадовай дзейнасці прадставілі на выстаўку Беларускі Дзяржаўны універсітэт імя Леніна, Мінскі політэхнічны інстытут імя Сталіна, Мінскі медыцынскі інстытут, музей Янкі Купалы, Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, бібліятэка імя Леніна і многія іншыя навуковыя і культурна-асветныя ўстановы рэспублікі.